ПРОЛЕТАРЫ УСІХ КРАЁЎ, ЗЛУЧАЙЦЕСЯ!

ЧЫРВОНАЯ ЗЬМЕНА

№ 92 (1361) | АЎТОРАК, 21-га красавіка 1931 г.



УЛАДЗІМЕР ІЛЬЛІЧ УЛЬЯНАЎ-ЛЕНІН

нарадзіўся ў 1870 годзе 22 красавіка

Уладзімер Ільліч--заснавальнік і кіраўнік УсеКП(б) і Комінтэрну; геніяльны правадыр і тэорэтык сусьветнай рэволюцыі

30 жніўня 1918 году эсэрка Каплан па даручэньню сваёй партыі страляла ў Леніна, выступаўшага на мітынгу на заводзе б. Міхельсона (цяпер імя Ул. Леніна) у Маскве.

Надломлены цяжкай работай і раненьнем, організм Леніна ня вытрымлівае.

21 студзеня 1924 году Ільліча пасьцігае сьмерць.

Памёр Ленін...Жыў ленінізм!

Да выхаду ў поле скончыць пераход на зьдзельшчыну

15 красавіка скончыўся тэрмін, вызначаны партыяй і ўрадам для пераводу колгасаў на зьдзельшчыну Аднак, ня гледзячы на тое, што тэрмін скончыўся, гэта работа праходзіць яўна нездавальняюча. Толькі 463 колгасы з 5820 пераведзены на зьдзельшчыну з улікам у працаднёх. Трэба адзначыць, што такія ганебна марудныя тэмпы работы па пераводу колгасаў на зьдзельшчыну ні ў якай меры не забясьпечаць ударных тэмпаў у час пасеву, якія асабліва дыктуюцца зацяжкай сёлетняй вясны.

Скарачэньне тэрміну сяўбы патрабуе асабліва напружаных тэмпаў у рабоце, высокай продукцыйнасьці працы. дакладнай расстаноўкі і 100 проц. выкарыстаньня працоўнай, цягавай сілы і машын.

Дасягнуць гэтага магчыма толькі: Ліквідаваўшы абязьлічку, прымацаваўшы да кожнай сельскагаспадарчай машыны, каня і г. д. сталага колгасьніка, увёўшы зьдзельшчыну і цьвёрдую норму выпрацоўкі

Да выхаду ў поле засталося зусім мала часу. Комсамольскім ячэйкам трэба па-баявому разгарнуць работу па ажыцьцяўленьню гэтай важнейшай дырэктывы партыі і ўраду.

Надаючы гэтаму пытаньню вялікае гаспадарча-палітычнае значэньне, „Чырвоная Зьмена“ накіравала ў Лёзьненскі раён спэцыяльную брыгаду, Мобілізаваўшы ўсю комсамольскую організацыю, брыгада па-ударнаму разгарнула барацьбу супроць абязьлічкі, за пераход колгасаў на зьдзельшчыну.

У сваю чаргу комсамольскія ячэйкі павінны шырока організаваць масавую працу сярод колгасьнікаў, прапрацаваць з імі пастановы 6 зьезду саветаў і Колгасцэнтру аб пераводзе колгасаў на зьдзельшчыну

На вытворчых нарадах распрацаваць нормы працы і расцэнкі ў працаднёх, для чаго выкарыстаць комсамольцаў-ударнікаў, якія даюць найвышэйшыя паказчыкі продукцыйнасьці працы.

Ліквідаваць абязьлічку, прымацаваўшы да кожнай машыны, каня сталага колгасьніка.

Організаваць брыгады колгасьнікаў для выкананьня паасобных відаў работ. Шырока разгарнуць сярод іх соцспаборніцтва і ўдарніцтва.

Весьці рашучую барацьбу з фактамі скажэньня сутнасьці зьдзельшчыны, якое выражаецца ў тым, што некаторыя колгасы, пераходзячы на зьдзельшчыну, ня ўлічваюць працу ў працаднёх. Трэба кіравацца прынцыпам: хто больш і лепш працуе, той больш і атрымае“.

Змагаючыся за найхутчэйшы пераход колгасаў на зьдзельшчыну за ліквідацыю абязьлічкі, шырокае разгортваньне соцспаборніцтва і ўдарніцтва, комсамольскія ячэйкі гэтым самым забясьпечаць пасьпяховае правядзеньне 2-й бальшавіцкай сяўбы.

Ударным правядзеньнем другой бальшавіцкай сяўбы ўзьнімем новы магутны прыліў у колгасы, нанясем руйнуючы ўдар па кулаку і яго агентах—опортуністых

ЦК РУМЫНСКАЙ КОМПАРТЫІ ЗАКЛІКАЕ

супроць фашысцкай дыктатуры, за работу і хлеб, за рабоча-сялянскі ўрад

ВЕНА, 18. Як паведамляюць з Бухарэсту, ЦК Румынскай компартыі зьвярнуўся з заклікам да ўсіх рабочых, сялян, салдат, прыгнечаных нацыянальнасьцяй з прычыны ўрадавага крызісу ў Румыніі.

ЦК констатуе, што пасьля эканомічнага і палітычнага банкруцтва ўраду Міронэску на зьмену выступіў Тытулеску, адданы слуга францускага і ангельскага фінансавага капіталу. На яго ўскладзены задачы па ўзмацненьню фашыцкай дыктатуры, правядзеньня програмы зьніжэньня зарплаты, новых масавых звальненьняў і падрыхтоўкі антысавецкіх афэр.

Далей у заклiку гаворыцца, што крах буржуазіі і абшарнікаў узмацняецца з тым, што на другім беразе Днястра ідзе пераможнае будаўніцтва соцыялізму.

Стварэньне новага ўраду—новы крок да адкрытай ваеннай дыктатуры. Перад працоўным Румыніі два шляхі: альбо фашыцкае няволь- ніцтва, альбо рэволюцыйная масавая барацьба супроць эксплёатацыі, супроць уціску фашыцкай дыктатуры, за работу і хлеб, за рабоча-сялянскі ўрад.

ЦК Румынскай компартыі заклікае працоўных Румыніі організаваць у знак протэсту супроць новага ўраду забастоўкі і дэманстрацыі, патрабаваць роспуску парляманту і габінэту. Адозва выстаўляе ў якасьці лёзунгу да новых парляманцкіх выбараў заваёву права на легальны ўдзел компартыі ў выбарах,ператварэньне выбарных сходаў і рэволюцыйнай дэмонстрацыі і ўсёй выбарнай кампаніі ў кампанію за рабоча-сялянскі ўрад. Адозва заканчваецца заклікам:

„Рабочыя! Організуйце камітэты барацьбы на прадпрыемствах супроць зьніжэньня зарплаты і звальненьняў, за 7-мі гадзінны рабочы дзень. Сяляне! Палеце даўговыя расьпіскі і падатковыя лісткі, разьмяркоўвайце міжсобку землі караля, буйных абшарнікаў і царквы, праганяйце жандараў, аслабаняйце політзьняволеных. Салдаты! Організуйце камітэты дзеньняў у казармах і лягерах для сумеснай барацьбы пролетарыяту пад кіраўніцтвам компартыі“.

Міжнародны пролетары ят рыхтуецца да першамайскіх сьвят

НЬЮ-ЁРК, 18.—Па ўсёй краіне вядзецца падрыхтоўка да першамайскіх дэмонстрацый. Абіраюцца камітэты рэволюцыйных рабочых організацый. У Філёдэльфіі была праведзена дэмонстрацыя 6000 рабочых.

БЭРЛІН, 16.—Фронт падрыхтоўкі да баявых першамайскіх выступленьняў у Нямеччыне пад лёзунгамі компартыі і рэволюцыйнай профопозыцыі пашыраецца з кожным днём. У Бэрліне за апошнія дні адбыліся шматлікія сходы рабочых і асабліва ў мэталяпрамысловасьці і на транспортных прадпрыемствах, дзе абраны першамайскія камітэты. Такія-ж камітэты абраны на шматлікіх сходах беспрацоўных.

У Гішпаніі насьпяваюць буйныя падзеі

ЛЁНДАН, 19.—Мадрыдзкі корэспондэнт газэты „Сэндэй Таймс“ паведамляе, што ў Гішпаніі насьпяваюць буйныя падзеі, і асабліва ў провінцыях, дзе сяляне пад кіраўніцтвам комуністых патрабуюць конфіскацыі абшарніцкіх зямель. У Алжэзырасе (блізу Гібралтару) натоўп атакуе памяшканьне мясцовага ўраду. Два ангельскія зьнішчальнікі, якія маюць на барту некалькі атрадаў салдат, адплылі з Гібралтара ў невядомым кірунку. Мяркуюць, што атрады накіроўваюць, альбо к Азорскім выспам (Португальская калёнія), дзе паўстанцы працягваюць утрымліваюць уладу ў сваіх руках, альбо ў гішпанскае Марокко, дзе адбываецца паўстаньне. Па вестках з гішпанскага Мароко, у Тэтуане (рэзыдэнцыя гішпанскага вярхоўнага камісара) ідуць баі.

Крывавая сутычка ў Сэвільі

ПАРЫЖ. 15.—Як паведамляе агенства Гавас, у Сэвільі комуністыя організавалі, наперакор забароне, мітынг, на якім прамоўцы рэзка выступалі супроць буржуазнага рэспубліканскага ўраду. Паліцыі, якая прыбыла для разгону мітынгу, удзельнікі яго аказалі супраціўленьне. Адбылася крывавая сутычка. Паліцыя адкрыла агонь па ўдзельніках мітынгу. Забіты адзін комуністы. з абодвух бакоў паранена 17.

Адступіўшы, комуністыя арганізавалі мітынг у другім раёне гораду.

З ПЕРАДАВЫХ ПОЗЫЦЫЙ.

ПЕРШЫ РЭЙД...

ЛЁЗНА. (Ад нашага спэцкора).

Спэцыялізаваная брыгада „Чырвонай Зьмены“ сумесна з Лёзьненскім Райкомам ЛКСМБ для практычнага вырашэньня мерапрыемства па ліквідацыі абязьлічкі і пераводу на зьдзельшчыну з улікам у працаднёх абралі адзін з буйнейшых колгасаў раёну „Бязбожнік“.

Колгас павінен зрабіцца вопытна-паказальнай лябараторыяй „Чырвонай Зьмены“, дзе разам з ліквідацыяй абязьлічкі і ўвядзеньнем зьдзельшчыны будзе правільна організавана праца на ўсіх вучастках, будзе вывучацца і прыстасоўвацца агро-тэхніка.

Колгас „Бязбожнік“ Унаўскага сельсавету аб'ядноае 150 гаспадарак і 1500 га. Мае абагуленых 75 продукцыйных кароў і 52 коні, 4 трактары.

Спэцыялізаваная брыгада „Чырвонай Зьмены“ організавала ў колгасе ўдарную штурмавую брыгаду з 25 колгасьнікаў комсамольцаў.

Брыгадзіры штурмавой: Сьвечкін—пастух колгасу мае 65 гадоў, былы батрак, зараз ударнік. Аболін Юрка—бядняк, 75 гадоў самы стары колгасьнік. Караліёва Ганна—старуха ўдарніца. У брыгаду ўвайшла і беспартыйная маладзь: Каралькова Марта, Агнясьцінава Тэкля, Казлоў Лука і іншыя.

З брыгадай накіроўваемся для першага рэйду ў суседнюю вёску Пунішчы, Ставім задачу—да вясновай сяўбы колектывізаваць вёску. Разьбіўшыся на групы, заходзім да кожнага аднаасобніка і запрашаем на сход.

Разам з гэтым, бярэм іх у індывідуальную апрацоўку.

Праз гадзіну ўсе вяскоўцы на сходзе. Робіць даклад старшыня колгасу Крумін аб рашэньнях VI зьезду саветаў і выніках работы сярод колгасу. „А зараз вось, мы ўдарнікі прышлі да вас падзяліцца сваімі перамогамі, дасягненьнямі і недахопамі, каб разьбіць кулацкую брахню. Мы прышлі вас запытаць, ці вы з колгасам, ці з кулаком, бо нэйтральнасьці быць ня можа. Вы павінны вырашыць:—за, альбо супроць. Колгасны шлях—праверапы шлях. Мы вас клічам пайсьці па гэтым шляху і ўліцца ў наш „Бязбожнік“,—так закончыў свой даклад старшыня.

Затым пайшлі пытаньні і гарачыя спрэчкі.—„Слова мае брыгадзір тав. Сьвечкін“. І 65-гадовы колгасьнік-ударнік дзеліцца думкамі аб жыцьці колгасу і таксама заклікае беднякоў і серадпякоў у колгас. Не забыў сказаць і пра політыку:—„Тут вось адзін гаварыў, што таго няма, гэтага няма. А я скажу так: як мы ўзялі вельмы шыбкія тэмпы, аб гэтым вось таварыш гаварыў, будуем многа заводаў трактароў, станцый розных, дык мы павінны будаваць усё гэта, а потым і тое і другое будзе. Вось як!“.

Пасьля Сьвечкіна выступае жывёлавод Казлоў Лука і іншыя брыгадзіры штурмавой. Многа яшчэ гаварылі. Перад аднаасобнікамі стаяла колгасная праўда добрага жыцьця, вялікіх дасягненьняў колгасу. 25 чалавек з штурмавой брыгады былі жывымі сьведкамі гэтай праўды для аднаасобнікаў.

Беднякі і серадпякі ў гэты самы вечар адказалі з кім яны. 15 бядняцка-серадняцкіх гаспадарак у гэты вечар пайшлі па выпрабаваным колгасным шляху. 15 аднаасобнікаў сёньня сталі колгасьнікамі колгасу „Бязбожнік“ і яшчэ 20 засталіся заўтрашнімі колгасьнікамі.

Першы рэйд скончан. Яшчэ многа рэйдаў прыдзецца прарабіць штурмавой ударнай брыгадзе імя „Чырвонай Зьмены“.

ГРЫЦКО ЛОГВІН,

ПАЎТОРЫМ СЛАВУТУЮ ГЭРОІКУ У БАРАЦЬБЕ ЗА БУЛЬБУ

Радыёграма райкомам комсамолу

Ворша, Горкі, Дрыбін, Расна, Чавусы, Шклоў, Капыль, Коханава, Кругпае, Сенна, Крупкі, Халопенічы, Лепель, Вулла, Ветрына, Смалявічы, Лагойск, Бялынічы, Клічаў, Чачавіцы, Ст. Быхаў, Ст. Дарогі, Слуцак, Грэск, Старобін, Тураў, Петрыкаў. Капаткевічы, Ельск, Нароўля, Хойнікі, Юравічы, Брагін, Мазыр, Парычы, Жлобін, Рагачоў, Прапойск, Журавічы, Буда-Кашалёва, Уваравічы, Рэчыца, Ветка, Чачэрск, Касьцюковічы, Дуброўна.

Надаючы выключнае політычнае значэньне загатоўцы і адгрузцы насеннай бульбы Ленінграду, Украіне і Маскве, Цэнтральны камітэт ЛКСМБ катэгорычна прапануе прыняць тэрміновыя захады дзеля актыўнага ўдзелу ў сваячасовым выкананьні дадзеных раёнам кантрольных заданьняў, мобілізаваўшы ўсю комсамольскую організацыю на правядзеньне гэтай справы.

ЦК абавязвае і даручае правядзеньне ўсёй работы па выкананьню плянаў адгрузкі бульбы бюро РК комсамолу і брыгадзе ЦК ЛКСМБ, якія працуюць на пасеўнай кампаніі. Згодна пастановы ЦК КП(б)Б і Саўнаркому БССР, адгрузка павінна быць скончана 25-га красавіка.

Аб прынятых захадах і ходзе адгрузкі інформуйце ЦК.

Заг. орг.-інстр. аддз. ЦК ЛКСМБ Пацукоў.

КУЛЬТЭСТАФЭТА ЗГУБІЛАСЯ Ў ДАРОЗЕ

У Менску яшчэ не мобілізаваны працоўныя масы на ажыцьцяўленьне маршрутаў культэстафэты другога этапу

Неадкладна ліквідаваць прарыў, надаць культэстафэце бальшавіцкі разгон!

Культэстафэта зьяўляецца магутным сродкам мобілізацыі мас рабочых, колгасьнікаў і ўсіх працоўных на барацьбу за ажыцьцяўленьне задач культурнай рэволюцыі.

Пазаўчора, на паседжаньні ўсебеларускага штабу культэстафэты, выразна акрэсьліўся прыкры малюнак разгортваньня культэстафэты другога этапу ў Менску. Штаб заслухаў справаздачу Менскага гарадзкога штабу і вынікі налёту на рад цэнтральных устаноў.

Справаздача Менскага гарадзкога штабу выявіла, што... ніякага штабу пры Менскім Гарадзкім савеце фактычна ня існуе. Гарадзкая інспэктура нарасьветы абураюча безадказна аднеслася да дырэктыў партыі аб разгортваньні культэстафэты другога этапу.

У пэрыод з 15-га сакавіка па 1-е красавіка, як вядома, патрэбна было правесьці культманэўры, якія павінны былі зьявіцца масавай падрыхтоўчай работай да старту культэстафэты другога этапу.

У часе культманэўраў патрэбна было ў першаю чаргу, шляхам масавых налётаў на ўсе школы, навучальныя і культасьветныя ўстановы выявіць усе недахопы. Трэба было ў часе гэтага падрыхтоўчага этапу правесьці сходы на прадпрыемствах, на якіх растлумачыць задачы эстафэты і папулярызаваць маршруты яе, прыцягнуўшы на іх (сходы) шырокія колы працоўных; організаваць вярбоўку новых культармейцаў, разгарнуць з імі баявую работу, правільна расставіць сілы і сродкі і г. д. Адным словам, патрэбна было разгарнуць ажыцьцяўленьне цэлага раду мерапрыемстваў, якія забясьпечылі-б актыўны ўдзел працоўных мас Менску ў культэстафэце другога этапу. Старт другому этапу, паводле дырэктыў усебеларускага штабу, неабходна было правесьці у дні 1—5 красавіка.

Нічога гэтага ня было зроблена. Культманэўры не праводзіліся. Старту эстафэце другога этапу ня дадзена. Ні на адным з прадпрыемстваў Менску яшчэ і да гэтага часу нічога практычна ня зроблена па ажыцьцяўленьню маршрутаў.

Цэнтральнае праўленьне саюзу працасьветы ня ўзьняло масы асьветнікаў на правядзеньне другога этапу культэстафэты.

Белколгасцэнтр ня вынес пэўных вурокаў для сябе па ўдзелу ў культэстафэце. Яшчэ ў часе першага этапу культэстафэты Белколгасцэнтр абмежаваўся абежнікам, гэта было ў кастрычніку 1930 году. Цяпер-жа, у часе другога этапу, Белколгасцэнтр нічога практычнага не зрабіў. Працаўнік Белколгасцэнтру т. Калмык нават ня ведаў аб тым, што ён зьяўляецца членам усебеларускага штабу.

У ВСНГБ брыгадзіру давялося аж тры дні хадзіць, каб даведацца, што зроблена па культэстафэце. Брыгадзірам адказалі: культэстафэтай у ВСНГ ведае т. Валасевіч. Калі-ж прыехаў т. Валасевіч, дык толькі „парадаваў“, што „першы этап культэстафэты праходзіў, калі я тут не працаваў. другі этап нас не закрануў, пытаньне аб культэстафэце ў нас не абгаварвалася“.

У Белкоопсаюзе брыгадзіру адказалі так: „Бачыце, пра першы этап культэстафэты мы пісалі ліст. але дзе ён і якія вынікі з яго ня ведаем“. Інструктар культ-бытавога сэктару т. Гуценкава заявіла: „Калі-б я парылася ў маіх паперах, магчыма тое-сёе і знайшла-б пра культэстафэту, але для гэтага трэба... тры дні капацца ў справах“.

Загадчык-жа культсэктару Белкоопсаюзу т. Паноў нават ня ведаў аб тым, што ідзе другі этап культэстафэты.

У Белбюро ЦК чыгуначнікаў адважыліся заявіць: Мы маем сувязь непасрэдна з Масквой, а распараджэньне Менску нас не датычыць“. (!!?)

У ЦП Саюзу зямляробчых саўгасаў нават няма культ працаўніка.

ЦП Саюзу машынатрактарных станцый толькі гэтымі днямі разглядала пытаньне аб уключэньні ў другі этап культэстафэты. „Ухвалілі, даручыць культмасаваму сэктару распрацаваць мерапрыемствы па правядзеньню другога этапу культэстафэты“.

Паданыя вышэй факты красамоўна гавораць аб тым, што ў цэлым радзе цэнтральных устаноў усё яшчэ пануе опортуністычная недаацэнка такога важнага мерапрыемства, як культэстафэта.

Які-ж удзел у этафэце прымае комсамол—шэф усеагульнага навучаньня? Налёт паказаў, што работа па культэстафэце праводзіцца апаратным парадкам.

На 6-е мая склікаецца агульна-настаўніцкая конфэрэнцыя аб політэхнізацыі школ.


Праведзен агляд трох вытворчых колектываў па пытаньню ажыцьцяўленьня політэхнізацыі. Брыгадзіры не знайшлі ў Гаркоме пратаколаў і матар'ялаў па культэстафэце другога этапу. Вясковай часткі комсамольскіх ячэек ня дадзена ніякіх указаньняў аб ажыцьцяўленьні маршруту культэстафэты. Маса комсамольцаў і беспартыйнай рабочай моладзі ня ўцягнута ў ажыцьцяўленьне задач культэстафэты.

Патрэбна неадкладна ўжыць рашучыя захады для таго, каб усёй рабоце надаць масавы характар. Патрэбна рашуча ўдарыць па тых, хто ігноруе дырэктывы партыі ў галіне культурнай рэволюцыі. Вінаватыя ў зрыве культэстафэты павінны быць прыцягнуты да суровай адказнасьці.

Трэба зараз-жа мобілізаваць шырокія масы працоўных Менску на барацьбу з прарывамі ў культурным будаўніцтве, на актыўны ўдзел ва ўсебеларускай культ эстафэце.

Менск павінен быць у першых радох тых, хто нясе культэстафэту ўперад! Менск павінен прыйсьці да фінішу пераможцай!

МІХ.



Алілуйшчыкі асьвятляюць шлях культэстафэце другога этапу

ПЛЯН РАБОТЫ ЦК ЛКСМБ

з 15 красавіка па 1-е ліпеня 1931 году

Бюро ЦК

23 красавіка

1. Аб вырашэньні кармовай проблемы і ўдзеле ЛКСМБ

Даклады: НКЗ, Церахаўскага РК ЛКСМБ і колгаснай ячэйкі, Смалявіцкага РК ЛКСМБ і саўгаснай ячэйкі (рыхтуе с.-г. сэктар ЦК)

2. Аб удзеле ЛКСМБ у будаўніцтве беларускай і нацменаўскай пролетарскай літаратуры.

Даклады БелАПП, рэдакцыі газэты „Чырвоная Зьмена“ (рыхтуе аддз. адук. і быту ЦК).

3. Даклад рэдакцыі газэты „Чырвоная Зьмена“. („Чыр. Зьмена“)

4. Вынікі ўдзелу ЛКСМБ у перавыбарах саветаў 1931 году. (Рыхтуе орг. аддз. ЦК ЛКСМБ і ЦВК)

28 красавіка

1. Вынікі выкананьня прамфінпляну за першы квартал 1931 году пад кутом праверкі выкананьня рашэньняў зьезду ЛКСМ аб стопроцантным уцягненьні комсамольскай організацыі ва ўдарніцтва, якасьць работы ўдарных брыгад і плянава-опэрацыйных груп.

Даклады Менскага і Віцебскага гаркомаў комсамолу; садаклады: колектыву КСМ і цэх ячэйкі абутковай фабрыкі—Менск, колектыву КСМ і цэх'ячэйкі зав. Мэтпром—Віцебск. (Рыхтуе мас.-экон. аддз. ЦК і ВСНГБ)

2. Праверка выкананьня дырэктыў аб рабоце ЛКСМБ сярод батрацтва і беднаты.

Даклады: Гарадоцкага РК ЛКСМБ і аднэй вясковай ячэйкі, Рачыцкага РК і аднэй колгаснай ячэйкі. (Рыхтуе Орг. аддзел ЦК)

3. Праверка выкананьня дырэктыў па спэцыялізацыі ільнаводных раёнаў і ўдзел ЛКСМБ.

Даклады: РК ЛКСМБ—Дрыса і аднэй саўгаснай ячэйкі. Бярказіцкага РК і аднэй колгаснай ячэйкі (рыхтуе с.-г. сэктар ЦК)

8 мая

1. Праверка рэалізацыі сельскіх абавязацельстваў комсамолу па электрыфікацыі.

Даклады ВЗО. Аршанскага РК КСМ і колектыву КСМ Белгрэс, колектыву КСМ Эльводу—Менск (рыхтуе масава-экономічны аддзел ЦК).

2. Праверка выкананьня рашэньняў зьезду ЛКСМ па уцягненьню рабочай моладзі і фабзавучнікаў у саюз.

Даклады: гаркому КСМ—Гомель і колектыву ФЗВ заводу Ланцуцкага; Гарком КСМ—Менск і ФЗВ швейнікаў; цэх. ячэйкі колектыву фабрыкі „Чырвоная Бярэзіна“—Барысаў. (Рыхтуе оргаддзел ЦК).

3. Удзел і работа піонэрорганізацыі ў выкананьні пляну 3-га году пяцігодкі па прамысловасьці і колектывізацыі сельскай гаспадаркі (у разрозе выкананьня дагавору паміж піонэрорганізацыяй і ВСНГБ, ЦСПСБ, НКЗБ).

Даклады ЦБ ДКО, Полацкага РК і вытворчага піонэратраду, Краснапольскага РК ЛКСМБ і аднаго колгаснага атраду ЮП (рыхтуе ЦБ ДКО).

4. Становішча комсамольскай работы Н-скай дывізіі.

Даклад: нач. подзіву і камісіі па агляду. (Рыхтуе вайсковы аддзел ЦК).

18 мая

1. Аб удзеле комсамолу ў прамысловым будаўніцтве (у разрозе выкананьня програм будаўніцтва, падрыхтоўкі новых кадраў і аўладаньня тэхнікай).

Даклады: Белдзяржбуду, ГК КСМ Гомель і колектыву КСМ Белдзяржбуду, Крычаўскага РК КСМ і ячэйкі цэмантнага заводу. (Рыхтуе масава-экономічны аддзел ЦК).

2. Праверка выкананьня рашэньняў ЦК УсеЛКСМ і праверка ўдзелу КСМ аб ліквідацыі політычнай няпісьменнасьці ў вясковым комсамоле.

Даклады: Мазырскага РК КСМ і колгаснай ячэйкі, Тураўскага РК КСМ і вясковай ячэйкі. (Рыхтуе аддзел тэорыі і прапаганды ЦК).

3. Аб выкананьні пастановы ЦК ЛКСМБ па ўдзелу ў нацкультбудаўніцтве ў галіне правядзеньня беларусізацыі.

Даклады: Віцебскага і Гомельскага РК КСМ, даклады: колектыў КСМ чыгункі—г. Віцебску і колектыву КСМ заводу Ланцуцкага—Гомель. (Рыхтуе аддзел адукацыі і быту ЦК).

4. Даклад ВСФСКБ аб становішчы фізвых руху. (Рыхтуе аддз. адук. і быту ЦК).

28 мая

1. Аб перабудове саюзнага кіраўніцтва пад кутом выкананьня рашэньняў зьезду.

Даклады: Бабруйскага РК КСМ і колектыву дрэваапрацоўчага комбінату Лельчыцкага РК і аднэй колгаснай ячэйкі. (Рыхтуе орг. аддз. ЦК, мас.-экон. і с.-г. сэктар).

2. Праверка выкананьня рашэньняў па жывёлагадоўлі ў спэцыялізаваных раёнах.

Даклады: Уваравіцкага РК КСМ і саўгаснай ячэйкі, Хоцімскага РК і аднэй колгаснай ячэйкі. (Рыхтуе саўгассэктар ЦК).

3. Праверка выкананьня рашэньняў зьезду і II-га пленуму ЦК ЛКСМБ аб вайсковай рабоце.

Даклады: Менскага ГК КСМ, колектыву чыгункі і аднэй цэх'ячэйкі Койданаўскага РК КСМ і аднэй колгаснай ячэйкі (рыхтуе вайсковы аддзел ЦК).

8 чэрвеня

1. Праверка выкананьня рашэньняў зьезду аб працы сярод моладзі нацменшасьцяй.

Даклады: Парыцкага і Нараўлянскага РК КСМ. (Рыхтуе аддзел адукацыі і быту ЦК).

2. Аб становішчы комсамольскага кіраўніцтва піонэрорганізацыяй.

Даклады: Слуцкага РК КСМ і вытворчай ячэйкі; Плешчаніцкага РК КСМ і аднэй колгаснай ячэйкі (рыхтуе ЦБДКО)

3. Вынікі вясеньняй сяўбы і падрыхтоўка да ўборачнай кампаніі.

Даклады Крупскага РК КСМ і ячэйкі, Плешчаніцкага РК і аднэй колгаснай ячэйкі. (рыхтуе ст. сэктар і мас.-эк. аддзел ЦК).

4. Праверка выкананьня рашэньняў II-га пленуму ЦК ЛКСМБ па аўладаньню і прапагандзе тэхнічных ведаў.

Даклады: Менскага ГК КСМ і колектыву заводу „Комунар“, Віцебскага ГК і колектыву абутковай фабрыкі, колектыву КСМ Магвалакнабуду. (Рыхтуе мас.-эк. аддзел ЦК).

18 чэрвеня

1. Работа ячэек КСМ па організацыі працы ў колгасах, увядзеньне зьдзельшчыны, разгортваньне соцспаборніцтва і ўдарніцтва.

Даклады: Клімавіцкага РК КСМ і аднэй колгаснай ячэйкі, Лепельскага РК і колгаснай ячэйкі. (Рыхтуе с.-г. сэктар і мас.-эк. аддзел ЦК).

2. Праверка выкананьня рашэньняў зьезду ЛКСМ аб росьце саюзу ў вёсцы ў напрамку стварэньня ячэек КСМ пры кожным колгасе.

Даклады: Буда-Кашалёўскі РК КСМ і колгаснай ячэйкі, Чэрыкаўскага РК КСМ і колгаснай ячэйкі (рыхтуе оргаддзел ЦК).

3. Даклад рэдакцыі газэты „Юнгер Арбэйтэр“. (Рыхтуе аддзел тэорыі і прапаганды ЦК).

4. Становішча работы сярод саматужнай моладзі.

Даклады: Сьмілавіцкага і Слуцкага РК КСМ, Белсамрамсаюзу (рыхтуе мас.-эк. аддзел ЦК).

28 чэрвеня

1. Праверка работы комсамольскай організацыі па падрыхтоўцы і перадачы комсамольцаў у партыю.

Даклады: Гомельскага ГК КСМ і колектыву КСМ фабрыкі „Вэзувій“, Жлобінскага РК КСМ і колектыву КСМ чыгункі (рыхтуе Орг. аддзел і аддзел тэорыі і прапаганды ЦК).

2. Праверка выкананьня рашэньняў другога пленуму ЦК ЛКСМБ па ўдзелу КСМ у рабоце спажыв. кооперацыі.

Даклады: Барысаўскага РК КСМ і колектыву заводу „Домбаль“, колектыву КСМ фабрыкі „Герой Працы“—Гомель, ячэйкі прыгарадная гаспадаркі МЦРК. (Рыхтуе Мас. эк. аддзел ЦК).

3. Ход дарожнага будаўніцтва і ўдзел ЛКСМБ.

Даклады: двух РК КСМ, Галоўдартрансу (Рыхтуе мас. эк. аддзел ЦК.)

4. Аб сыстеме падрыхтоўкі піонэрскіх кадраў.

Даклады ЦБ ДКО Наркомасьветы. (Рыхтуе ЦБ ДКО)

Сэкратарыят ЦК

23 красавіка

1. Вынікі лютаўскага набору ў ФЗВ.

Даклады: аддзелу кадраў ВСНГБ, Наркомпрацы БССР, аддзелу кадраў Заходняй і МББ чыгунак, Віцебскага ГК КСМ (Рыхтуе аддзел адукацыі і быту ЦК).

2. Вынікі мобілізацыі сродкаў за першы квартал 1931 году і праверка выкананьня соцдагавору з Украінай.

Даклады: Галоўнага кіраўніцтва ашчадкас і двух РК КСМ (Рыхтуе масава-эк. аддзел ЦК).

3. Даклады ЦКК КСМ аб організацыйнай перабудове работы (Рыхтуе ЦКК, оргаддзел ЦК).

3 мая

1. Аб ходзе паходу за вывучэньне рэволюцыйнай тэорыі па гарадзкой організацыі ЛКСМБ.

Даклады: Менскага ГК і аднаго вытворчага колектыву—Менск (Рыхтуе Аддзел тэорыі і проп. ЦК)

2. Вынікі транспартнай нарады. (Мас-эк аддзел ЦК).

3. Аб перавыбарах бюро ячэек ЛКСМБ. (Орг. аддзел ЦК).

4. Вынікі організацыйнага перакомплектаваньня піонэрорганізацыі (Рыхтуе ЦБ ДКО)

У комсамольскім паходзе за тэхніку

ВІЦЕБСК—НА СТАЯНЦЫ

Абвешчаная Гаркомам комсамолу тэхнічная трывога павінна мобілізаваць усю організацыю на выкананьне задач па аўладаньні тэхнікай

Разгорнуты зараз „Чырвонай Зьменай“ масавы агляд-праверка выкананьня Віцебскім комсамолам пастаноў зьездаў і мерапрыемстваў, зьвязаных з паходам комсамолу за тэхніку, паказвае, што Віцебская комсамолія выйшла ў паход за тэхніку ня ў поўнай баявой падрыхтаванасьці, не мобілізавала ўсю масу комсамольцаў і беспартыйнай моладзі на ажыцьцяўленьне гэтых задач.

Ля варштату паход комсамолу за тэхніку не адчуваецца.

Характэрнай зьяўляецца праца комсамольскага колектыву акулярнай фабрыкі. На фабрыцы прарыў. Фабрыка сыстэматычна ня выконвае прамфінплян.

Прарывы яшчэ больш паглыбляюцца тым, што мэханізмы, варштаты скарыстоўваюцца злачынна нерацыянальна.

Комсамольскі колектыў фабрыкі нічога ня робіць у гэтым напрамку. Ён, як і іншыя грамадзкія організацыі фабрыкі, не зразумеў асноўнага, што барацьба за тэхніку зьяўляецца барацьбой за прамфінплян.

Абвешчаная Гаркомам комсамолу тэхнічная трывога павінна мобілізаваць усю організацыю на выкананьне задач па аўладаньню тэхнікай, прыцягнуць да гэтай справы ўсю беспартыйную моладзь.

Трывога ў паходзе

Невялікі рух, некаторыя добрыя пачынаньні ў галіне аўладаньня тэхнікай зроблены ў час разгортваньня праверкі выкананьня, але нагэтуль пастанова Гаркому ня была прапрацавана.

Кіраўніцтва раду ячэек і колектываў недаацаніла задачы аўладаньня тэхнікай як аднаго з момантаў барацьбы за прамфінплян.

Права-апортуністычныя адносіны да гэтай справы не атрымалі належнага адпору. Партыйныя ячэйкі належным чынам не кіравалі працай комсамольскіх ячэек па ўладаньню тэхнікай. Фабзаўкомы—ўбаку ад гэтай справы.

На ініцыятыве нашай брыгады, Гаркомам ЛКСМБ абвешчана з 15-га па 25-е красавіка тэхнічная трывога.

Задача трывогі—разгарнуць у кожнай ячэйцы сыстэматычную працу па аўладаньню тэхнікай. Перад ячэйкамі высунуты конкрэтныя задачы, якія павінны быць выкананы за час трывогі: дабіцца ажыцьцяўленьня задач высунутых тав. Сталіным пастаноў 9-га зьезду комсамолу: Ажыцьцявіць задачу 100%-нага ахопу тэхнічнай вучобай комсамольцаў і беспартыйнай моладзі. Організаваць соцыялістычнае спаборніцтва паміж брыгадамі, цэхамі, паміж ячэйкамі на лепшую працу па аўладаньню тэхнікай.

У час трывогі організаваць сыгнальныя пасты „Чырвонай Зьмены“ якія павінны рэгулярна інформаваць газэту аб працы організацыі па аўладаньню тэхнікай.

Трывога павінна ўцягнуць усю комсамолію і беспартыйную моладзь на выкананьне задачы аўладаньня тэхнікай.

Вынікі, дасягнутыя ў час трывогі, організацыя павінна будзе замацаваць надалей, ператварыць іх у сыстэматычную працу.

Комсамольцы акулярнай ня выйшлі ў паход

(Ад нашага спэцкора)

Віцебская акулярная фабрыка мае прарыў у прамфінпляне. За першую пяцідзёнку красавіка прамфінплян выкананы на 84,04 проц., за другую—на 79,51 проц.

Асноўная прычына прарыву—няўменьне выкарыстаць усе магчымасьці на выкананьне прамфінпляну.

Зьвернемся да фактаў.

На фабрыцы не ведаюць пропускной здольнасьці абсталяваньня, не ўлічана пропускная магчымасьць працуючых мэханізмаў. Паспортызацыя варштатаў, за выключэньнем некаторых, не праведзена. Ня ўлічана вытворчасьці таго ці іншага мэханізму, у тых ці іншых умовах працы. А за гэтым—пакажчыкі норм выпрацоўкі мэханізмаў не абасаваны.

Мэханізмы цалкам не скарыстоўваюцца. Некалькі дзён таму назад, па загаду адміністрацыі, быў перанесены ў новае памяшканьне газагенэратар фабрыкі. З-за зьмены адлегласьці ад газагенэратара да пункту скарыстаньня газу, а значыцца зьмены шляху, які павінен праходзіць газ, ён перастаў у бэнзын і праца ў цэху спынілася.

Газагенэратар прышлося зноў перавозіць на старое месца.

У выніку „дзейнасьці“ тэхнічна-нясьвецкіх кіраўнікоў за другую пяцідзёнку шліфавальны цэх сарваў праграму у выкананьні прамфінпляну.

Вось яшчэ факт. Калі на фабрыцы выйшлі сьвёрлы, было загадана перайсьці да выпрацоўкі новых шарніраў, што патрабавала ўдасканаленьня абсталяваньня і выклікала значны прарыў у выкананьні прамфінпляну цэху. Калі-б гэты пераход быў сваечасова падрыхтаваным, дык не адбіўся-б на выкананьні прамфінпляну.

У шліфавальным цэху налічваецца процант браку з-за дэформаваньня шліфавальных чашак, гэта можна было папярэдзіць, але і тут узяліся за працу так, калі сталі перад фактам значнага павялічэньня браку.

Гэтыя факты з усёй відавочнасьцю сьведчаць, што, ліквідаваўшы такую бесгаспадарчую сыстэму кіраўніцтва, тэхнічныя „неваражкі“, якія сталі хранічнаю зьявай з прычыны тэхнічнай непісьменнасьці і няздольных кіраўнікоў да працы,—фабрыка, пры росту актыўнасьці шырокіх мас, здолее ліквідаваць прарыў у выкананьні прамфінпляну.

Партыйнае, прафсаюзнае і комсамольскае кіраўніцтва фабрыкі апортуністычна недаацэньваюць значэньня паходу за тэхніку, як аднаго з [illegible] ліквідацыі прарыву.

Комсамольскі колектыў фабрыкі слухаў 21-III—г. г. даклад аб становішчы выкананьня прамфінпляну на фабрыцы, але не мобілізаваў у зьвязку з наяўнасьцю прарыву комсамольскую масу і беспартыйную моладзь на выкананьне лёзунгу тав. Сталіна, і пастановы ЦК УсеЛКСМ аб паходзе за тэхніку.

Пастанова пленуму Гаркому аб конкрэтных мерапрыемствах па аўладаньню тэхнікай на Віцебскай організацыі не знайшла свайго ажыцьцяўленьня ў працы комсамольскай організацыі фабрыкі.

Партколектыў зусім недастаткова працуе ў гэтай галіне. Бюро, разгледзеўшы зварот тульскіх рабочых, налічыла найлепшым ускласьці адказнасьць за справу разгортваньня паходу за тэхніку на аднаго сябра колектыву.

Профорганізацыя фабрыкі гэтым пытаньнем зусім не займалася.

Так апортуністы Віцебскай акулярнай фабрыкі ігнаруюць выкананьне пастаўленай партыяй задачы: „бальшавікі павінны аўладаць тэхнікай“.

Неабходна зьбіць апортуністычныя рагаткі на шляху выкананьня прамфінпляну. Ажыцьцяўленьне задачы аўладаньня тэхнікай стане для фабрыкі дапаможнікам у ліквідацыі прарыву.

П.

Заняткі гурткоў тэхнікі зрываюцца

Прамова тав. Сталіна аб аўладаньні тэхнікай прапрацоўвалася на бюро і на сходзе комсамольскага колектыву панчошнай фабрыкі імя „Клары Цэткін“. Сярод усёй масы рабочых яна не прапрацоўвалася. Фабком абмяжаваўся фармальным разглядам гэтага пытаньня на паседжаньні.

Заняткі організаваных гурткоў тэхнікі зрываюцца. У дні заняткаў прызначаюцца розныя нарады, сходы. Наведваньне гурткоў вельмі дрэннае. Замест 50-ці чалавек на заняткі прыходзяць 15—20.

ІТС вельмі нядбайна адносіцца да ўдзелу ў працы комсамольскіх яч. па аўладаньню тэхнікай. ІТС фабрыкі яшчэ дагэтуль ня выпрацавала тэхнічнага мінімуму, на якому павінен праходзіць тэхбой.

Па ініцыятыве комсамольскага колектыву у цэхах організавана ўдарная скразная брыгада якасьці імя тав. Сталіна. У вязальным цэху організавана вітрына браку (па тэхнічных прычынах і па віне рабочых).

Партыйная ячэйка ня кіруе працай комсамольскай ячэйкі па аўладаньню тэхнікай.

А. К.

Добрыя пачынаньні засталіся ў папках бюро

Бюро колектыву ЛКСМБ фабрыкі „Дзьвіна“ выпрацавала рад мерапрыемстваў па ажыцьцяўленьню пастаноў аб аўладаньні тэхнікай: організацыя тэхнічных гурткоў, наведваць школу, прапрацаваць заклік тульскіх рабочых. Але гэтыя мерапрыемствы далей бюро колектыву не пайшлі.

Большасьць ячэек гэтым пытаньнем не займаюцца. Організаваны гурток тэкстыльшчыкаў яшчэ не мае кіраўніка. Тэхпрацоўнікі не прыцягнуты да працы па аўладаньні тэхнікай.

Брыгада А. Т. П. К.

ГАСПАДАРЧЫ РАЗРАХУНАК—У БРЫГАДУ

Адкрыты ліст да ўсіх ударных брыгад нашага заводу, да ўсіх брыгад заводаў БССР ад комсамольскай комуны сьлесароў па зборцы сьвідравальных варштатаў імя 518 чырвонаштандарнага заводу імя Варашылава

Дарагія таварышы! Выкананьне прамфінпляну у 3-м рашаючым годзе пяцігодкі па ўсіх яго паказчыках (зьніжэньне сабекошту, пад'ёмы вытворчасьці працы, мобілізацыя і рацыянальнае выкарыстоўваньне ўнутраных рэсурсаў) асабліва ў 1931 годзе, зьяўляецца пытаньнем, якое вырашае выкананьне ў скарочаны тэрмін нашага пяцігадовага пляну соцбудаўніцтва, пасьпяховае завяршэньне пабудовы фундаманту соцыялістычнай эканомікі.

Вытворчая праграма і усе мерапрыемствы, прадугледжаныя пяцігадовым плянам у 1931 г., павінны быць выкананы поўнасьцю.

Мы маем усе магчымасьці, усе рэсурсы, каб задачы, якія стаяць у 3-м рашаючым годзе пяцігодкі, былі выкананы.

Ня гледзячы на рад дасягненьняў у кіраўніцтве нашай вытворчасьці мы маем тут недапушчальныя моманты расхлябанасьці, безадказнасьці, хвасьцізму і права-опортуністычнай практыкі.

Мы яшчэ ня маем конкрэтных фактаў каб уся вытворчая і гаспадарчая праца правяралася рублём, адсюль недавыкананьне паасобных паказчыкаў прамфінпляну.

Пастаўленыя партыяй і ўладай асабліва важныя палітычныя і гаспадарчыя задачы, пераход на гаспадарчы разьлік, выклікалі і выклікаюць поўнае адабрэньне рабочае клясы. Але мы не павінны дапушчаць скажэньня гэтага палітычна-гаспадарчага пытаньня. Мы яго пасьпяхова выканаем, калі паставім правядзеньне жорсткага гаспадарчага разрахунку пад неаслабны кантроль ударнікаў.

Наш завод з 1-га красавіка перавёў усе цэхі на гаспадарчы разрахунак. Праўда, мы гэта зрабілі без неабходнай падрыхтоўчай работы, без дастатковай растлумачальнай працы, без масавага ўдзелу рабочых ударнікаў і работніц. Дзеля гэтага былі недарэчнасьці, непаразуменьні.

Часам у брыгадзе не хапае тае ці іншае деталі для сборкі сьвідравальных варштатаў, мы ня цікавімся даведацца прычыны, чаму яе няма, а ідзем у цэх, бярэм другія.

Траба пакласьці канец гэтаму свавольству, гэтай безадказнасьці. Мы, рабочыя ўдарнікі вытворчай комуны сьлесароў па зборцы сьвідравальных варштатаў імя 518, просім начальніка цэху перавесьці нашу камуну з 1-га мая на гаспадарчы разрахунак. Забясьпечыць нас сваечасовай дастаўкай усіх дэталяй, давесьці прамфінплян ня толькі ў колькасных паказчыках, але і ў іншых паказчыках, як зьніжэньне сабекошту, узьняцьце вытворчасьці працы і інш. мерапрыемствы.

Таварышы рабочыя і ўдарныя брыгады! Мы зразумелі наколькі важна ў пэрыод завяршэньня пабудовы соцыялістычнай эканомікі Савецкага саюзу, пытаньне пераходу на гаспадарчы разрахунак.

Мы зварочваемся да вас з заклікам: не на словах, а на справе прыступіць да шырокага абгаварэньня і правядзеньня ў жыцьцё пераводу на гаспадарчы разрахунак цэхаў, брыгад і зьмен.

Мы ўпэўнены, што наш заклік знойдзе патрэбнае падтрыманьне і вы, пад кіраўніцтвам партыйных і профсаюзных організацый, па-бальшавіцку прыступіце да хутчэйшага і сур'ёзнага выкананьня гэтай задачы.

ПЛЯН РАБОТЫ ЦК ЛКСМБ

(Канец. Пачатак гл. на 2 старонцы)

3 чэрвеня

1. Праверка выкананьня рашэньняў 1-га ўсебеларускага зьлёту „ЛК“.

Даклады: Быхаўскага РК КСМ і групы „ЛК“—Менск. (Рыхтуе оргаддзел ЦК, ЦКК КП(б)Б).

2. Праверка выкананьня рашэньняў ЦК аб удзеле КСМ у рабоце па рэорганізацыі профсаюзаў. (Рыхтуе мас.-эк. аддзел ЦК).

3. Аб становішчы дзіцячай працы ў колгасах і саўгасах. (Рыхтуе ЦБ ДКО).

13 чэрвеня

1. Даклад В-ва „Чырвоная Зьмена“ (Рыхтуе аддзел творы і прапаганды).

2. Аб ходзе другога туру культэстафэты.

Даклады: двух РК КСМ, аднаго вытворчага колектыву, Цэнтральнага штабу культэстафэты. (Рыхтуе аддзел адукацыі і быту ЦК).

3. Праверка рашэньняў бюро ЦК ЛКСМБ аб летняй аздароўчай рабоце сярод падлеткаў.

Даклады: Галоўсоцстраху Наркомаховы здароўя, двух РК КСМ. (Рыхтуе мас.-эконом. аддзел ЦК).

23 чэрвеня

1. Даклады транспортных організатараў КСМ Воршы, Жлобіну, ячэйкі КСМ цягі—Ворша, ячэйкі руху—Жлобін, пад кутом праверкі выкананьня дырэктыў ЦК УсеЛКСМ і ЛКСМБ па ўдзелу ў рабоце на транспорце. (Рыхтуе мас.-эк. аддзел ЦК).

2. Вынікі ўсебеларускай нарады сакратароў ячэек навучальных устаноў. (Рыхтуе аддзел адукацыі і быту).

3. Аб удзеле піонэрорганізацыі ў падрыхтоўцы масавых кадраў для ФЗВ і ШКМ. (Рыхтуе ЦБ ДКО).

4. Аб становішчы і пэрспэктывах разьвіцьця дзіцячага друку. (Рыхтуе ЦБ ДКО, Аддзел творы і прапаганды).

13 мая

1. Праверка практычнага ўдзелу комсамольскай організацыі па шэфству над авіофлётам.

Даклады: Гомельскага ГК. Рагачэўскага РК, політаддзелу авіо брыгады (Вайсковы аддзел ЦК),

2. Аб становішчы разгортваньня культмасавай работы сярод працоўнай моладзі.

Даклады: Бабруйскага РК КСМ, колектыву КСМ фабрыкі Клары Цэткін—у Віцебску, Дому комсамолу і рэдакцыі „Чырвонай Зьмены“ (Рыхтуе аддзел адукацыі і быту ЦК).

3. Даклад загадчыка сельска-гаспадарчай станцыі аб рабоце і далейшых пэрспэктывах (Рыхтуе сельска-гаспадарчы сэктар ЦК)

4. Аб ходзе падрыхтоўкі да піонэрскай лягернай кампаніі. (Рыхтуе ЦБ ДКО)

23 мая

1. Даклады комсамольскіх колектываў Гомсельмашу і Бабруйскага комбінату аб выкананьні програм сельска-гаспадарчага машына будаўніцтва. (Рыхтуе мас.-эконом. аддзел ЦК)

2. Праверка становішча работы комсамолу на рачным транспорце ў разрэзе рэалізацыі пастаноў Усесаюзнай нарады.


Даклады: Гомельскага ГК і ячэйкі КСМ прыстані Магілеўскага РК КСМ (Рыхтуе масава-эк. аддзел ЦК)

3. Становішча акцябрацкага руху (Рыхтуе ЦБ ДКО)

4. Аб усебеларускай нарадзе прадстаўнікоў КСМ у профсаюзах. (Рыхтуе мас. эконом. аддзел ЦК)

Да другой гадавіны соцспаборніцтва

У першых радох соцыялістычнага будаўніцтва



Моладзь, з якое рыхтуюцца кадры для нашай прамысловасьці зараз займае пэўнае месца ў барацьбе за выкананьне пяцігодкі.

У вучобе, соцспаборніцтва і ўдарніцтва сталі мэтодам штодзённай працы.

У Слуцкай профтэхшколе шырока разгарнулася ўдарніцтва. Лепшыя ўдарнікі прэміяваны.

Профтэхшкола зьяўляецца прыкладам сапраўды ўдарнай працы ў дапамогу колгасу. Вучні пасьля цэхавых заняткаў рэзалі жалеза для патрэб колгасу. Ужо нарэзана звыш 150 пудоў.

На здымку: Прэміяваныя ўдарнікі Слуцкай профтэхшколы: Казановіч Сымон, і Карповіч Уладзімер за працай.

ВЫКАНАЦЬ УЗЯТЫ АБАВЯЗАК

Усім РК ЛКСМБ

Выкананьне прынятага абавязацельства ЦК ЛКСМБ перад вайскова-паветранымі сіламі БВА аб пабудове зьвяна самалётаў праходзіць нездавальняюча. Рад райкаў і колектываў не накіравалі сабраныя сродкі ў ашчадкасу, дзеля гэтага ЦК прапануе прыняць захады, каб як найхутчэй выканаць прынятыя абавязацельствы, разгарнуўшы шырокую масава-палітычную работу і збор сродкаў, якія накіроўваць: Менск, Дзяржаўная ашчадкаса № 16, на бягучы рахунак ЦК ЛКСМБ № 05124.

Заг. Вайсковага аддзелу ЦК ЛКСМБ ГУЗІКАЎ.

Уносім і выклікаем

Комсамольскі колектыў шорнай фабрыкі „Усход“ сабраў 150 рублёў на пабудову самалёта „Комсамолец Беларусі“. Збор сродкаў працягваецца. Колектыў выклікае паслядаваць свайму прыкладу комсамольскую ячэйку ф-кі імя Крупскай.— **Бацьвінін**

Комсамольскі колектыў Заслаўскага куста сабраў 50 рублёў на пабудову самалёта „Комсамолец Беларусі“ і выклікае на соцспаборніцтва Сёмкава-Гарадзецкую комсамольскую ячэйку.

Ячэйка КСМ пры колгасе „Шлях селяніна“ Бялыніцкага раёну, сабрала 36 рублёў на пабудову самалёта „Комсамолец Беларусі“ і выклікае паслядаваць свайму прыкладу комсамольскі ячэйкі раёну. **Жур.**

ДАМО РСЧА
тысячы чырвоных камандзіраў

Аб ходзе ўкомплектаваньня вайсковых навучальных устаноў

Пастанова Прэзыдыуму ЦВК

Прэзыдыум ЦВК заслухаў даклад старшыні Цэнтральнай камісіі па ўкомплектаваньню вайсковых навучальных устаноў тав. Васілевіча.

З дакладу выявілася, што вярбоўка ў вайсковыя школы праходзіць зусім нездавальняюча: рад гарсаветаў і РВК да гэтага часу не організавалі вярбовачных камісій; вакол вярбоўкі не разгорнута масавая работа. У выніку адзначаных недахопаў ёсьць пагроза правалу вайсковага набору ў вайсковыя школы.

Прэзыдыум ЦВК прапануе гарсаветам і РВК: узмацніць работу вярбовачных камісій, разгарнуўшы масавую работу вакол вярбоўкі; весьці барацьбу з выпадкамі адмовы прадпрыемстваў ад пасылкі рабоча-батрацкай моладзі ў вайсковыя школы.

Прэзыдыум ЦВК прызнаў мэтазгодным скарыстаць вайсковыя брыгады, якія пасылаюцца на прадпрыемствы, для правядзеньня мітынгаў, сходаў з мэтай вярбоўкі рабочае моладзі ў вайсковыя школы.

Спрэчкі па дакладу „Чырвонкі“ ў эфіры

Рапартамі конкрэтных спраў вітае комсамолія сваю газэту

Слухайце!.. Слухайце!.. Гаворыць Менск. Роўна а 7 гадзіне адчыняецца ў эфіры усебеларускі радыёсход комсамолу і чытачоў „Чырвонай Зьмены“.

Комсамольцы, юнкоры, рабочыя, колгасьнікі, настроіўшы прыёмнікі на 700 мэтровую радыё-хвалю, слухаюць даклад тав. Авісава аб дзесяцігадовым пераможным шляху „Чырвонай Зьмены“.

Даклад з яскравымі фактамі, лічбамі аб рабоце газэты скончан. Першае слова ў спрэчках мае Гомель. Прадстаўнік Гомельскага комсамолу, вітаючы старэйшую комсамольскую газэту „Чырвоную Зьмену“, расказаў як газэта і яе спецыялізаваныя брыгады штурмавалі і ліквідавалі прарывы на вытворчасьці, у прыгарадных гаспадарках Гомельшчыны, як гомельчане рыхтуюцца да юбілею, у гонар якога ўжо організаваны 3 колгасы.

Далей гаворыць Слуцак. Прадстаўнік Слуцкай комсамоліі і юнкораў тав. Прыбытак (кіраўнік юнкораўскай брыгады) рапартуе „Чырвонай Зьмене“: „Мы навакол дзесяцігадовага юбілею нашай баявой „Чырвонкі“ разгарнулі вялікую масавую работу і падносім падарункі: абвясьцілі „чырвоназьменаўскі“ набор у комсамол, ужо ўступіла 100 рабочых і колгасьнікаў. 31 колгас, пры актыўным удзеле комсамольскай організацыі і юнкораў, пераведзен на зьдзельшчыну з улікам у працаднёх. Падхоплена ініцыятыва „Чырвонай Зьмены“ аб ліквідацыі абязьлічкі і правільнай організацыі працы ў колгасах. Організавана з 7 чал. юнкораўская брыгада ў гор. Слуцку, у 5 колгасах організаваны насьценныя газэты. Заданьне па распаўсюджваньню „Ч. З.“ выканана ў раёне на 123 проц. Праводзім колгасна-вытворчы бой“.

Рапарт Случчыны скончаны. Кароткі, але затое з многімі конкрэтымі дзеяньнямі.

За Слуцкам, слова па дакладу бярэ Віцебск. Доўга настрайваецца радыё-перадатчык. Нарэшце ў мікрофона ад Віцебскай комсамоліі і рабочай моладзі з прывітаньнем і рапортам—тав. Шапіра. „Да 10 гадовага юбілею рапортуем конкрэтнымі дзеяньнямі і падарункамі юбіляру. Ударная юнкораўская брыгада ячэйкі МББ ст. Віцебск звыш тэрмінова рамантуе паравоз імя „Чырвонай Зьмены“. У адной вытворчай ячэйцы прынята па „чырвоназьменаўскаму“ набору 70 маладых рабочых і работніц у комсамол. На фабрыках і заводах організоўваюцца новыя ўдарныя брыгады імя „Чырвонай Зьмены“ і юнкораўскія брыгады.

Ад імя Аршанскага комсамолу ў спрэчках выступаў сакратар гаркому тав. Лапіцкі, які прывітаў баявы комсамольскі орган—газэту „Чырвоная Зьмена“. У канцы сходу ў спрэчках выступіў завод „Кастрычнік“ Сьвіслацкага раёну.

Скончыліся спрэчкі. Усе прамоўцы адзначалі вялікія дасягненьні і ролю „Чырвонай Зьмены“ у барацьбе за генэральную лінію партыі з рознымі ўхіламі, за выкананьне прамфінпляну пяцігодкі ў чатыры гады, за перабудову сельскай гаспадаркі на соцыялістычны лад.

Зачыняючы ўсебеларускай радыёсход, тав. Анісаў запэўніў, што „Чырвоная Зьмена“ і надалей з баявой напорыстасьцю будзе змагацца на перадавых позыцыях будаўніцтва соцыялізму. **А. У.**

У калёны юнкораў павінны ўліцца новыя ўдарнікі вытворчасьці і соцыялістычных палёў

Да юбілею „Чырвонай Зьмены“ засталося некалькі дзён. За гэты кароткі тэрмін кожная комсамольская ячэйка павінна падагуліць, што ёю праароблена на падрыхтоўцы да юбілею, якія конкрэтныя прапановы дала яна газэце.

10-год „Чыр. Зьм.“—10 гадовая гісторыя комсамолу Беларусі.

За гэты час газэта расла разам з комсамолам.

Пагэтаму, падыходзячы да юбілею, кожная ячэйка павінна падагуліць як „Чыр. Зьм.“ дапамагала ёй у практычнай працы, і як з свайго боку, ячэйка праводзіць у жыцьцё мерапрыемствы, высунутыя „Ч. З.“

Зьмешчаны намі раней матар'ял аб падрыхтоўцы да юбілею гаворыць за тое, што ня ўсе комсамольскія організацыі рыхтуюцца да юбілею. У прыватнасьці ў Менску, які павінен быць перадавым у падрыхтоўцы, выходзіць на адварот,—падрыхтоўка па Менскай організацыі праходзіць зусім слаба.

Астатнія дні да юбілею павінны быць скарыстаны комсамольскімі організацыямі па-ўдарнаму.

100 проц. ахоп студэнтаў „ЧЗ“

У Віцебскім мастацкім тэхнікуме шырока разгарнулася падрыхтоўка да юбілею. На кожным курсе вылучаны ўпаўнаважаныя „ЧЗ“, Зараз ужо можна ўпэўнена сказаць, што замест 48 экз. „ЧЗ“, якія мы маем у гэтым м-цы, да юбілею „ЧЗ“ даб'емся 100 проц. ахопу ўсяго студэнцтва падпіскай на „ЧЗ“. Гэтым самым рэалізуем пастанову ЦК ЛКСМБ аб давядзеньні тыражу „ЧЗ“ да 60 тысяч экз.

На кожным курсе тэхнікуму організаваны „чырвоназьменаўскія“ ўдарныя брыгады, якія ўзялі на сабе абавязак у адзнаку юбілею „ЧЗ“: рэалізаваць яе адозву—падняць на належную вышыню працу насьценгазэт, зрабіўшы яе люстрам усёй працы тэхнікуму, рэгулярна асьвятляючы ход соцспаборніцтва і ўдарніцтва, акадэмэстафэты паміж курсавымі пяцёркамі і курсамі і весьці рашучую барацьбу з ілжэ-ўдарнікамі, якія ў апошні момант на некаторых курсах —невыпадковая зьява.

20 красавіка ў тэхнікуме адбудзецца вечар, прысьвечаны юбілею „ЧЗ“.

Падрыхтоўка да юбілею „ЧЗ“—нашай баявой газэты—на поўным хаду. **У. Сокалаў.**

Мала асьвятляецца політэхнізацыя школ

Агульны сход комсамольскай ячэйкі колгасу „Зьвязда“ (Вульскі раён) абгаварыў пытаньне аб 10-цігадовым юбілеі „Ч. З.“.

Комсамольцы арцелі „Зьвязда“ з свайго боку даюць абавязкі. Выпісваць кожнаму комсамольцу газэту „Чырвоная Зьмена“ і завербаваць падпісчыкаў ня менш 5-ці асоб. Стаць юнкорамі „Чырвонай Зьмены“, бо гэта наша маладзёжная газэта, якая нас выхоўвае і дапамагае ў працы.

Грэчкін.

У адзнаку юбілею бяру на сябе рад конкрэтных абавязкаў

Да 10-ці гадовага юбілею „Чырвонай Зьмены“, я, як юнкор, бяру на сябе наступныя конкрэтныя абавязкі:

Завербаваць ня менш 15 падпісчыкаў на „Ч. З.“, наладзіць выпуск насьценгазэты ў колгасе „Першае Мая“, ліквідаваць поўнасьцю няпісьменнасьць двух асоб. Абвяшчаю сабе ўдарнікам на правядзеньне другой бальшавіцкай.

Выклікаю на соцспаборніцтва юнкораў: Піскуна Міхася, Лявіцкага Цімоха, (Сьмілаўскі раён), Канончыка) (Полацкі раён).

Алексяёнак Я. Н.

У зьвязку з юбілеем разгортваецца праца з газэтай

12-га красавіка ў вёсцы Вятчыны (Жыткавіцкі раён) быў склікан агульны адкрыты сход комсамольскай ячэйкі, дзе прысутнічала моладзі каля 150 чалавек.

На сходзе быў зроблены даклад аб юбілеі „Чырвонай Зьмены“ і „чырвоназьменаўскім“ наборы ў комсамол. У спрэчках высьветлілася што дагэтуль комсамольская ячэйка ніякай працы з газэтай не вяла.

Сход пастанавіў выпісваць усім прысутным „Чырвоную Зьмену“. Створаны юнкораўскія брыгады імя „Ч. З.“ і політ-гурткі для падрыхтоўкі беспартыйнай моладзі ў комсамол.

Ліўшыц.

У адзнаку юбілею, кожны комсамолец— укладчык у ашчадкасу

Ячэйка ЛКСМБ Койданаўскай МТС на сваім сходзе пастанавіла: У адзнаку 10-цігадовага юбілею „Ч. З.“ падпісацца кожнаму комсамольцу на „Чырвоную Зьмену“ тэрмінам ня менш, як на тры месяцы. Стаць усім комсамольцам укладчыкамі ашчадкасы і набыць усёй ячэйцы облігацыі пазыкі „Пяцігодкі—у чатыры гады“. Пасіліць працу ў колгасах па падрыхтоўцы да выхаду ў поле.

Складзена юнкораўская брыгада імя „Ч. З.“ з 7-мі чалавек трактарыстых.

Ж. Ю.

Папраўка

У № 90 „Чыр.Зьмены“ па віне карэктуры, дапушчаны грубыя іскажэньні:

1) У перадавой, „Дэклярацыя вялікадзяржаўнага шовіністага“, у пятым абзацы зьверху надрукавана: „Асьлеплены масавай ненавісьцю“ трэба:—„асьлеплены клясавай ненавісьцю“.

2) На першай паласе пад клішэ надрукавана:

. . . „Ня сталі ў старой Пяцігодкі“ трэба „Ня сталі ў строй пяцігодкі“.

Адказны рэдактар МІХ. ПЛАТАЎ.

Друкарня імя тав. Сталіна

Галоўлітбел № 599